■ Змена

ВАКАЦЫІ ПА ЎСТАВЕ

19 хлопцаў з Маскоўскага раёна Мінска на 9 дзён перабраліся ў 56-ы асобны полк сувязі ВПС і войскаў ППА. Увесь гэты час яны начуюць у казармах, а камандуюць імі сяржанты тэрміновай службы і афіцэры.

— Мы хочам навучыць юнакоў дзеянням ва ўмовах будучай ваеннай службы, — заўважае **намеснік начальніка палявога вузла сувязі па ідэалагічнай рабоце маёр Сяргей ПАЎЛАЎ.** — Рыхтаваць маральна і фізічна да гэтага іх лепш за ўсё ужо цяпер. Ім ужо ад 14 да 16 гадоў. Будучыя прызыўнікі! Ды і на занятках па дапрызыўнай падрыхтоўцы ім будзе лягчэй.

Праграма для школьнікаў вельмі насычаная. Непасрэдна на тэрыторыі часці яны вывучаюць агульнавайсковыя дысцыпліны: займаюцца страявой, агнявой, тактычнай і інжынернай падрыхтоўкай. Але і культурны складнік таксама вялікі — спланаваны экскурсіі, паходы па месцах баявой славы...

Таксама мы падрыхтуем нашых выхаванцаў да ваеннай эстафеты. Яна ўключае ў сябе дзесяць пунктаў, на якіх прадстаўлены разнастайныя элементы ваеннай справы. Сярод іх — настройка радыёстанцыі, пошук няспраўных катушак, размініраванне ўчастка, разборка-зборка зброі, снараддзянне магазіна, аказанне першай дапамогі, уменне паставіць палатку на некалькі чалавек... Адным словам, усё, што спатрэбіцца ім у будучыні ў войску.

Сярод сяржантаў, якія камандуюць хлопцамі, — толькі максімальна падрыхтаваныя. Двое з іх працавалі з новым папаўненнем і таму атрымалі вялікую практыку ў зносінах з людзьмі, якія да гэтага не мелі дачынення да вайсковай справы.

— Спачатку была ідэя арганізаваць такі лагер для навучэнцаў, якія стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх, — гаворыць **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце сярэдняй школы № 170 горада Мінска Святлана ЖОГАЛ.** — Каб дапамагчы ім арганізаваць сябе, сфарміраваць новыя рысы характару. Але з часам мы сталі набіраць не толькі такіх юнакоў, але і іншых хлопцаў, якія хочуць вызначыцца з прафесіяй, неяк сябе арганізаваць і дысцыплінаваць.

Анвару ХАДЖАЕВУ споўнілася 16 гадоў. У ваенна-патрыятычным лагеры ён упершыню.

— Да гэтага я нёс вахту на Пасту № 1, займаў высокія месцы на конкурсах па страявой падрыхтоўцы. Ёсць думкі паступаць у Ваенную акадэмію. Прыцягвае армейская тэма тым, што служылі брат, бацька і дзед. Таксама ўдзельнічаў у парадзе да Дня Незалежнасці. Калі маршыруеш, то на цябе ўсе глядзяць, і ты адчуваеш вялікую адказнасць. За першы дзень тут я навучыўся прыгожа запраўляць ложак. На страявых занятках мы рэпеціравалі пастраенне. Лягчэй мне і на дапрызыўнай падрыхтоўцы.

А вось пятнаццацігадовы **Сяргей ЦАРЛЮКЕВІЧ** у 56-м палку ўжо другі год запар.

— Летась мне ў школе расказалі пра гэты лагер і спыталі, ці не хачу я сюды з'ездзіць. Я пагадзіўся. І мне спадабалася. Тым больш што дзед — вайсковец, шмат расказваў пра службу. Сябрую і са спортам — ужо даволі даўно займаюся боксам.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

Кампетэнтна

Больш за 150 спартыўна-патрыятычных лагераў арганізуецца сёлета ў Беларусі. Мяркуецца, што ў іх паўдзельнічаюць каля 10 тысяч вучняў. Пра гэта заявіў **начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Уладзімір МАКАРАЎ.**

Іх работа вядзецца па спартыўна-тэхнічным, фізкультурна-спартыўным, ваенна-патрыятычным, абаронна-спартыўным кірунках. Міністэрства адукацыі рэалізуе ваенна-патрыятычныя адукацыйныя праграмы ва ўзаемадзеянні з Мінабароны, МУС, Дзяржпагранкамітэтам і МНС.

ЯК ПАДЛЕТКІ ГУЛЯЮЦЬ У «ЗАРНІЦУ»

У першай палове ліпеня ў краіне традыцыйна праходзіць рэспубліканскі злёт навучэнцаў, які наведваюць класы ваенна-патрыятычнай накіраванасці. Сёлета ён прысвечаны 100-годдзю Узброеных Сіл Беларусі.

Арганізатары, сярод якіх міністэрствы абароны і адукацыі, распрацавалі вялікую праграму злёту. Але самай відовішчнай стала ваенна-спартыўная гульня «Зарніца», якая прайшла на базе 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады.

102 вучні з усіх куткоў Беларусі з'ехаліся на ўскраіну Мінска. Сярод іх шмат дзяўчат. Яны паглядаюць на паласу перашкод, праз якую пабягуць праз паўгадзіны...

— На жаль, надвор'е за ноч сапсавалася. Трава мокрая, зямля мокрая, таму, нягледзячы на ўсё імкненне да перамогі, будзьце гранічна асцярожныя, — праводзіць інструктаж **намеснік камандзіра брыгады па ідэалагічнай рабоце палкоўнік Сяргей КОРНЕЎ.** — Важная поўная ўзаемадапамога, выручка. Будзеце праходзіць паласу перашкод — падайце руку, дапамажыце вылезці свайму калегу. І памятайце: залік ставіцца па апошнім чалавеку. У любым выпадку, незалежна ад выніку, — сваіх не кідаюць.

«Зарніца» — гэта спартыўная эстафета ваенна-палявой накіраванасці. І таму ўсе яе складнікі так ці інакш маюць дачыненне да спецыфікі вайсковай службы. Праўда, праграма яе была даволі спрошчана, паколькі ўсё ж такі дзейныя асобы — школьнікі, а не салдаты.

Цікавімся ў Сяргея Корнева: што ж чакае падлетка ў паласе перашкод?

— Ім трэба будзе перабрацца праз двухметровы роў, прабегчы праз лабірынт, пераадолець разбураную лесвіцу і вылезці з падземнага пераходу. А яшчэ — сабраць і разабраць аўтамат Калашнікава, аказаць параненаму першую дапамогу, надзець агульнавайсковы ахоўны камбінезон, знайсці міну, выканаць сілавыя практыкаванні... Праграма для ўсіх адзіная. Дзяўчаты пройдуць тыя ж выпрабаванні, як і хлопцы. Якіхсьці «льгот» для іх не будзе.

Да старту застаюцца лічаныя хвіліны, але мы паспяваем пагутарыць з некаторымі ўдзельнікамі «Зарніцы».

— Выбраў гэты кірунак, таму што лічу гэта годнай магчымасцю ў будучыні праявіць сябе, — кажа **вучань класа ваенна-патрыятычнага кірунку сярэдняй школы № 27 горада Бабруйска камандзір узвода кадэтаў Ягор РАЎНЕЙКА.** — Я ўжо ў адзінаццатым класе, і таму трэба выбіраць далейшы шлях у жыцці. Дзед мой — падпалкоўнік, служыў у органах унутраных спраў. Збіраюся ў Акадэмію МУС і я. А «Зарніца» — гэта цудоўная магчымасць праверыць сваю фізічную падрыхтоўку і маральныя якасці. Ну і, канешне ж, паступаць трэба ўжо з пэўнымі ведамі, якія спатрэбяцца ў далейшым.

Кадэт, віцэ-малодшы сяржант Мікіта СЯЛЕДЧЫК прыехаў са Слоніма.

— У нас працуе кадэцкі корпус, заснаваны на базе сярэдняй школы № 9. У мяне брат вучыўся ў кадэцкім класе, я пайшоў па яго слядах. Там фарміруюцца дысцыпліна, выпраўка, і хлопчык становіцца мужчынам. Садзейнічае гэтаму і «Зарніца». Думаю паступаць на ваенны факультэт пасля школы, як гэта зрабіў і мой брат.

Гучыць каманда — «На старт! Увага! Марш» — і першыя дзве дружыны ўжо бягуць на паласу перашкод...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.